# ЧЫМ АРАЛІ НАШЫ ПРОДКІ ?

М.Ф. АПЕЙКА, бібліятэкар БАТУ

Раней ужо аналізаваўся стан парку сельскагаспадарчых машын для арання, рыхлення глебы, для сяўбы і пасадкі раслін,для збору ўраджаю, для абмалоту збожжа, для касьбы траўя, для збору ўраджаю бульбы і буракоў у розных губернях дакастрычніцкай Беларусі.

Вынаходніцтвам сельскагаспадарчых машын у дакастрычніцкай Беларусі займаліся сяляне, шляхта, святары... .

Сярод конкурсаў, якія праводзіла Вольнае Эканамічнае Таварыства, неаднаразова бачым конкурсы па выпрабаванні арфавальных машын. Вольнае Эканамічнае Таварыства не толькі арганізуе падобныя конкурсы, выстаўкі, але і друкуе справаздачы аб іх, а гэтаксама дапаможныя матэрыялы па карыстанню лепшымі з выстаўленых машын, каталогі канструктарскіх чарцяжоў арфавальных машын, напрыклад, як гэта было ў 1871, 1872, 1880,1893, 1897 і 1898 гадах.

Аб арфавальных машынах пішуць К.Вебер, Ю.Вейс, Н.Дэланэ, Р.Зак, С.М.Ленін, М.Міцуль,У.У.Марачэўскі, В.Чарняеў і шмат іншых аўтараў - усіх проста цяжка пералічыць.І не дзіўна : калі казаць пра ручныя веялкі на Беларусі, то з лічбаў статыстыкі мы бачым, як упарта і няўмольна машыны для арфавання выцясняюць згаданыя прыстасаванні для веяння. Дарэчы, цікава, што ў беларускай мове ручное прыстасаванне для веяння завецца веялкай, а вось машына для гэтага завецца арфаю, як і сам машынны працэс - арфаваннем, у адрозненне ад працы ручной - веяння.

І гэта, безумоўна, сведчыць аб багацці беларускай мовы, якая кожнай з'яве, кожнаму працэсу, па магчымасці, кожнай адрознай ад іншых праяве, у тым ліку і машыне, імкнецца даць сваё адметнае найменне.

І не дзіва, што вынаходніцкай справаю тут займаліся ўсе ,як ужо раней было згадана, у тым ліку і святары, напрыклад, святар Акітневіч з Клімавіцкага павета, які ў 1892 годзе вынайшаў арфу для збожжа, аб чым ў наступным, 1893 годзе паведаміў у Вольнае Эканамічнае Таварыства.

Сапраўды, арф было шмат. Напрыклад, у Віленскай губерні іх працавала 4593 машыны, з якіх сяляне валодалі 1209, астатнія належалі панскім маёнткам, а было гэта ў 1910 годзе. Цікава, што па паветах гэтыя машыны размяркоўваліся даволі разнастайна як у сялянскіх, гэтак і ў панскіх гаспадарках.Найбольш такіх машын было ў Дзісненскім павеце - там агулам іх было 1575, прычым сялянам належала 712 машын.

На другім месцы ў Віленскай губерні па агульнай колькасці арф быў Ашмянскі павет, дзе працавала 1465 такіх машын (1337 панскіх машын, 128 - сялянскіх).

У Лідскім павеце было 862 арфы (676 панскіх, 186 - сялянскіх), а ў Вілейскім павеце арф было 691 (508 панскіх, 183 сялянскіх).

Шмат гэта ці не? Паглядзім, колькі было гэтых машын было ў суседняй Гродзенскай губерні , параўнаем.

У Гродзенскай губерні агулам было 3573 такіх машыны, з якіх сялянам належала 1146 машын, а панскім гаспадаркам - 2427.

Найбольшая колькасць сялянскіх арф працавала ў Бельскім павеце - тут іх было ва ўладанні сялян 486. На другім месцы па гэтым паказчыку быў Гродзенскі павет з 183 сялянскімі машынамі, трэцяе месца зусім лагічна займаў Брэсцкі павет з 131 сялянскай арфай.Цікава, што і па колькасці панскіх машын лідзіраваў

гэтаксама Бельскі павет , дзе панскім маёнткам належала 651 арфа, а другое і трэцяе займалі Кобрынскі і Гродзенскі паветы (309 і 294 машыны адпаведна).

А ці шмат было такіх машын у Мінскай губерні?

У Мінскай губерні працавала агулам 11857 арфавальных машын, з якіх сялянам належала 5358, а панскім гаспадаркам - 6499 арф.

Ужо раней было зазначана, што найбольш за ўсё стымулявалі заўжды механізацыю, ды і ўвогуле прагрэс грамадства гандаль і адукацыя.Так было заўжды, паўсюль, і Беларусь , вядома ж, не выключэнне, а, хутчэй, вельмі яскравая ілюстрацыя гэтага закона.

Сапраўды, там, дзе перакрыжоўвалася найдольш розных шляхоў зносін , там, дзе найлепей быў развіты гандаль і адначасова было найбольш зносін культурнага і адукацыйна- асветніцкага характару, - там і тэхніка была заўжды развіта лепей, бо, дзякуючы і адукацыі, і патрэбам існавання і развіцця гандлю, у такіх месцах найбольш спрыяльна развіваўся рынак, у прыватнасці, сельскагаспадарчай тэхнікі .

І таму зусім слушна, што , напрыклад, па колькасці арфавальных машын у Мінскай губерні на першым месцы быў Мінскі павет(3271 арфа, прычым сялянам належала 1452 машыны, астатнія 1819 былі ўласнасцю панскіх гаспадарак ).

Другое месца тут займаў Ігуменскі павет (2886 арф, з іх 1062 - сялянскія, 1824 - панскія). Трэцяе і чацвёртае месцы тут займалі Слуцкі і Бабруйскі паветы(адпаведна 1518 і 1236 арфавальных машын, прычым, што цікава, менавіта ў гэтых паветах сяляне мелі болей машын, чым панскія гаспадаркі - у Слуцкім павеце сялянам належала876, панам - 672 машыны, а ў Бабруйскім павеце - сяляне мелі 652 машыны, а паны - 584).

Крыху адставаў ад названых раней паветаў Мінскай губерні Барысаўскі - тут было 1045 машын, прычым сялянам належала 540, а панам - 505 машын для арфавання. Зноў гэткая самая цікавая перавага. Што ж, менавіта ў гэтых паветах Мінскай губерні вельмі актыўна працавалі разнастайныя навучальныя ўстановы сельскагаспадарчага профілю, разнастайныя месячныя, двухтыднёвыя, гадавыя курсы па розных галінах сельскай гаспадаркі як для мужчын, гэтак і для жанчын, менавіта тут мы бачым побач з ніжэйшымі сярэднія і сярэднія спецыяльныя, а гэтаксама рамесныя сельскагаспадарчыя навучальныя ўстановы .Менавіта тут бачым традыцыйна вялікую колькасць разнастайных кірмашоў розных напрамкаў селькагаспадарчай дзейнасці, а конкурсы па сельскагаспадарчым машынабудаванні тут гэтаксама сталіся добрай традыцыяй.Хто гэта ўсё ладзіў ? Гэтым займалася Вольнае Эканамічнае Таварыства, прычым настолькі актыўна і добра ішлі справы гэтай арганізацыі на Беларусі, што да 1841 года (пакуль не забаранілі) існавала нават Беларускае Вольнае Эканамічнае Таварыства . Але Вольнае Эканамічнае Таварыства не кідала гэтай высакароднай справы і пазней, супрацоўнічала з Мінскім Таварыствам сельскіх гаспадароў, з 1898 года - з кааперацыйнымі аб'яднаннямі сельскіх гаспадароў, а яшчэ пазней - з Мінскім земствам, з Мінскай Балотнай станцыяй і з урадавымі аграномамі Мінскай губерні, якія шмат працавалі дзеля адукацыі сялян.

І зусім не выпадкова, што перадавая грамадскасць Беларусі пасля забароны Гора-Горацкага земляробчага інстытута (з-за ўдзелу выкладчыкаў і студэнтаў гэтага інстытута ў паўстанні Каліноўскага) патрабавала аднаўлення вышэйшай сельскагаспадарчай навучальнай установы - у сетцы сельскагаспадарчай адукацыі Беларусі надта адчувальна патрабавалася вышэйшая селькагаспадарчая навучальная ўстанова. Іншая справа, што царскі ўрад не дазволіў аднавіць вышэйшую сельскагаспадарчую адукацыю на Беларусі. Быў атрыманы дазвол на адкрыццё ў Пятроўска-Разумоўскім, пад Масквою, прычым, галоўным чынам, сіламі выпускнікоў Гора-Горацкага земляробчага інстытута Пятроўска-Разумоўскага земляробчага інстытута, а пазней яшчэ і Вышэйшых Жаночых Сцебутаўскіх Сельскагаспадарчых курсаў, аналага Бястужаўскіх(медычных).

І ўся згаданая вышэй дзейнасць па адукацыі сялянства, як мы ўжо бачылі па прыведзеных лічбах, давала добры плён. Рынак сельскагаспадарчай тэхнікі імкліва пашыраўся.Попыт нараджаў прапанову. Павялічвалася і колькасць адукаваных гаспадароў, і якасць машын трывала ўдасканальвалася, прычым па ўсіх катэгорыях сельскагаспадарчых машын.

*Працяг. Пачатак у №№ 1,2,4 за 1997 г., 1,2 за 1998 г.*